ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
3
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 21 (1359)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА




**Высокая палітычная актыўнасць студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта характарызуе перадвыбарную кампанію. Гэта яскрава праяўляецца на сустрэчах выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты. Іх удзельнікі падводзяць вынікі работы мясцовых Саветаў, засяродзіўшы ўвагу на пытаннях камуністычнага будаўніцтва. З глыбокай зацікаўленасцю абмяркоўваюць задачы, звязаныя з рэалізацыяй Харчовай праграмы.**

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

·Учора·Сёння·Заўтра·

### ГРАНДЫЁЗНАЙ ПРАГРАМЕ

інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі краіны была прысвечана гутарка, што адбылася ў інтэрнаце № 2. Перад савецкімі і замежнымі студэнтамі факультэта журналістыкі выступілі выкладчыкі факультэта А. В. Балаш, В. Р. Булацкі. Яны расказалі аб асноўных палажэннях Харчовай праграмы, адказалі на шматлікія пытанні студэнтаў.

**С. ДАРАШЭНКА.**

### НА МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫМ

факультэце прайшла канферэнцыя, прысвечаная XIX з'езду ВЛКСМ. Яна пачалася літаратурна-музычнай кампазіцыяй «Скрозь ветры неспакойныя», якую з дапамогай супрацоўнікаў бібліятэкі падрыхтавалі студэнты-першакурснікі. Уражаннямі аб рабоце з'езда падзяліўся яго ўдзельнік сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Рухля.

**А. КІШКЕВІЧ,
супрацоўніца аддзела масавай работы бібліятэкі.**

### ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ

эфектыўнасці навуковых даследаванняў у плане міжвузаўскага супрацоўніцтва з замежнымі ВНУ і ўкаранення рэзультатаў навукова-даследчых работ, выкананых супрацоўнікамі універсітэта за мяжой, былі абмеркаваны на чарговым пасяджэнні КНК універсітэта. Затым была заслухана інфармацыя аб рабоце універсітэцкіх школ народных кантралёраў.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

### У АКТАВАЙ ЗАЛЕ

універсітэта прайшоў абласны агляд-конкурс агітбрыгад СБА, у якім прымалі ўдзел будатрадаўцы ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Мінска і Мінскай вобласці. Універсітэт на аглядзе прадстаўляла агітбрыгада СБА «Медыум» філалагічнага факультэта, якая стала лаўрэатам конкурсу.

**П. ІВАНОЎ,
камісар штаба працоўных спраў.**

● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

## ЖЫЦЦЁВЫ ПРЫНЦЫП

Усе экзамены на атэстат сталасці Іосіф Андрушкевіч здаў на выдатна. Летам працаваў паштальёнам у сваёй вёсцы на Вілейшчыне і рыхтаваўся да ўступных экзаменаў на радыёфізічны факультэт БДУ. Конкурс ён вытрымаў паспяхова. І вось ужо на зыходзе „пяты, апошні. год вучобы ва універсітэце.

Звычайная, на першы погляд, студэнцкая біяграфія. Але ўдумайцеся ў такі факт: амаль увесь час вучобы ва універсітэце Іосіф Андрушкевіч з'яўляецца ленінскім стыпендыятам. Гэта значыць, усе пяць гадоў ён — першы. І ў вучобе, і ў грамадскім жыцці. З першага курса Андрушкевіч—член камітэта камсамола факультэта.

На маё пытанне, як удаецца яму ўсюды паспяваць, Іосіф адказаў:

— Мой жыццёвы прынцып: калі ўзяўся за справу — даводзь яе да канца. Калі б вучыўся не ў поўную сілу — адчуваў бы, што займаю чужое месца...

За плячыма ў Іосіфа амаль пяць студэнцкіх гадоў. За гэты час выпрацаваўся пэўны padыход да заняткаў:

— Галоўнае не спяшацца занатаваць кожнае слова выкладчыка: перш за ўсё на лекцыях трэба думаць, спрабаваць зразумець сутнасць новага матэрыялу. А потым у інтэрнаце дастаткова перачытаць канспект, і новая тэма трывала засвоена.

Аднойчы, калі Андрушкевіч займаўся ў бібліятэцы, да яго падышоў таварыш па курсу: «Навошта лезеш углыб? І надвор'е цудоўнае...» А потым гэты «філосаф» прасіў Андрушкевіча дапамагчы пры падрыхтоўцы дыпломнага праекта...

Задаю яшчэ адно пытанне Іосіфу:

— Якая падзея апошняга часу была найбольш значнай для цябе?

Ён адказаў не вагаючыся:

— У лістападзе 1981-га мяне прынялі кандыдатам у члены КПСС. Цяпер, на пачатку жыцця, няма для мяне падзеі больш значнай.

**В. ЖДАНКО,
студэнт журфака.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ

## ТВОРЧАСЦЬ—З'ЕЗДУ

МНОГІЯ камсамольскія арганізацыі краіны і нашай рэспублікі, рыхтуючыся да свайго вышэйшага форуму, датэрмінова выканалі ўзятыя ў гонар XIX з'езда ВЛКСМ абавязацельствы. Лепшым з лепшых ад нашай рэспублікі выпаў гонар удзельнічаць у рабоце з'езда. 11-тысячную камсамольскую арганізацыю БДУ імя У. І. Леніна прадстаўляў сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Рухля.

Каб прыняць удзел у святочным канцэрце, прысвечаным адкрыццю XIX з'езда ВЛКСМ, у Маскву з'ехалася звыш 700 прадстаўнікоў лепшых творчых калектываў нашай краіны, сярод якіх былі ансамбль танца «Радасць» з Брэста, ансамбль пантамімы «Рух» і народны эстрадна-харэаграфічны ансамбль «Чараўніцы» з Мінска.

Пастаноўка канцэрта здзяйснялася пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР В. Васільева, народнага артыста СССР Ю. Сіланцьева, народнага артыста СССР М. Гадэнкі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола А. Жаромскага.

У канцэрце прымалі ўдзел каля 2000 чалавек. Ён стаў своеасаблівым аглядам творчых сіл моладзі краіны.

**Л. ЕЛІСЕЕВА,
удзельніца народнага эстрадна-харэаграфічнага ансамбля «Чараўніцы», старшы інжынер кафедры фізікі цвёрдага цела.**

## Сардэчна віншуем!

**Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі:**

**АНАТОЛЬ ІЛЬІЧ ГЛУШЦОЎ**— ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар **Яўген Аляксеевіч Іваноў;**

**ТХЕ ЛОНГ ФАМ** — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар **Фаіна Міхайлаўна Кірылава;**

**АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ ДУДЗІН** — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар **Генадзь Аляксеевіч Мядзведзеў;**

**МАРЫЯ ІВАНАЎНА ТАРАСІК** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Валянцін Дзмітрыевіч Ткачоў;**

**МІХАІЛ АЛЯКСАНДРАВІЧ СЯНЮК** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Аляксандр Міхайлавіч Саржэўскі;**

**ІГАР СЦЯПАНАВІЧ АНДРЭЕЎ** — юрыдычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Андрэй Васільевіч Дулаў;**

**ВАСІЛЬ АЛЯКСАНДРАВІЧ ТРАЦЦЯКОЎ** — кафедра палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік **дацэнт Уладзімір Ільіч Максін;**

**МІХАІЛ НІЧЫПАРАВІЧ БАСЯКОЎ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт **Антон Антонавіч Лабуда;**

**АЛЯКСАНДР ЛЬВОВІЧ ГУЛЕВІЧ** — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар **Рыгор Лазаравіч Старобінец.**

**Жадаем новых творчых поспехаў!**

# КУРС НА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

АСНОЎНЫМ ПАТРАБАВАННЕМ, якое стаіць перад прафсаюзамі і таварыствамі рацыяналізатараў і вынаходнікаў, у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС з'яўляецца рэалізацыя ўстаноўкі партыі на павышэнне эфектыўнасці народнай гаспадаркі і якасці работы і хутчэйшае ўкараненне ў вытворчасць вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў.

Перад навукова-даследчымі ўстановамі краіны ставіцца зараз адказная задача — у 1,5 раза павялічыць тэмпы абнаўлення тэхнікі, паскорыць укараненне новай тэхнікі і навейшай тэхналогіі. Неабходна паскорыць распрацоўку і забяспечыць рэалізацыю мэтавых комплексных праграм па скарачэнню ручной, асабліва цяжкай працы. Гэтыя ўказанні ў поўнай меры адносяцца да працоўных нашай рэспублікі, у прамысловасці якой занята ручной працай звыш адной трэці працуючых. Яшчэ большая іх доля ў будаўніцтве і сельскай гаспадарцы.

Значная роля ў рашэнні гэтых задач адводзіцца навуковым работнікам, інжынерам і тэхнікам, што аб'ядноўваюцца ў навукова-тэхнічныя таварыствы і таварыствы рацыяналізатараў і вынаходнікаў, якія з'яўляюцца найбольш масавымі.

Калектывам Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна праведзена значная работа па павышэнню эфектыўнасці і якасці навукова-даследчых работ і паскарэнню ўкаранення закончаных распрацовак. Так, у цэлым па універсітэту эканамічны эфект ад укаранення НДР за 1980 — 81 гг. перавысіў 45 мільёнаў рублёў. Найбольшы эканамічны эфект у 1981 годзе атрыманы фізічным факультэтам (5118 тысяч рублёў), факультэтам радыёфізікі і электронікі (4442 тысячы рублёў), хімічным факультэтам (3200 тысяч рублёў), НДІ ПФП (8250 тысяч рублёў).

Палепшылася распрацоўка тэм па патэнтна-інфармацыйнаму даследаванню як на стадыі планавання, так і ў час выканання НДР. Калі ў 1980 годзе на ўзроўні вынаходніцтваў выконвалася 75 працэнтаў навукова - даследчых работ прыродазнаўчага профілю, то ў 1981 годзе іх доля склала 100 працэнтаў. Гэта дазволіла толькі за 1980 — 1981 гады падаць 700 заяў на мяркуемыя вынаходніцтвы і атрымаць 405 станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў.

Усё большую долю ў навуковай дзейнасці універсітэта займаюць работы, накіраваныя на рашэнне комплексных праблем па важнейшай тэматыцы. Напрыклад, стварэнне ў НДІ ПФП лідарных станцый для дыстанцыйнага кантролю аэразольных забруджванняў атмасферы дазволіла сэканоміць некалькі мільёнаў рублёў, а ў працэсе распрацоўкі станцый было атрымана шмат аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы.

З энтузіязмам працуюць вынаходнікі і рацыяналізатары універсітэта, аб'яднаныя ў пярвічную арганізацыю УТВР, якая налічвае звыш 700 чалавек. Палепшыліся прапаганда і інфармацыя па пытаннях вынаходніцтва. Арганізавана вучоба ў галіне вынаходніцкай і патэнтнай работы. Хацелася б адзначыць станоўчы вопыт работы грамадскіх кансультацыйных пунктаў на кафедрах хімічнага факультэта, якія праводзяць экспертызу і аказваюць дапамогу супрацоўнікам у афармленні вынаходніцтваў. Заслугоўваюць увагі таксама створаныя ў НДІ ФХП групы укаранення закончаных распрацовак.

Разам з тым у рабоце савета УТВР БДУ імя У. І. Леніна яшчэ не цалкам выкарыстоўваюцца рэзервы для павышэння эфектыўнасці навукова-тэхнічных распрацовак. Мясцовы камітэт універсітэта, дакладна прааналізаваўшы работу пярвічнай арганізацыі УТВР, пастанавай ад 13 мая 1982 года намеціў шляхі павышэння якасці і эфектыўнасці навукова-даследчай дзейнасці. Асаблівая ўвага аддаецца ўдзелу падраздзяленняў універсітэта ў праграме скарачэння ручной працы на прадпрыемствах рэспублікі, а таксама неабходнасці распрацовак з зацікаўленымі прадпрыемствамі сумесных планаў па ўкараненню вынікаў даследаванняў. Неабходна таксама больш шырокае ўкараненне ў вучэбны працэс прылад, макетаў і стэндаў, абароненых аўтарскімі пасведчаннямі.

Мясцоваму камітэту і савету УТВР БДУ неабходна накіраваць свае намаганні на рашэнне ключавых навукова-тэхнічных праблем, прыцягнуць да гэтай важнай работы больш шасць супрацоўнікаў і дабівацца ўкаранення вынаходніцтваў, распрацаваных ва універсітэце, з максімальным эканамічным эфектам.

**У. ГОЛЬЦАЎ,**
**член мясцкома універсітэта, загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, прафесар.**



**● ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ**

# КАЛІ СПРАВА ПА ДУШЫ

— МОЖНА? — адчыняю дзверы. І аднекуль здалёк раздаецца прыемнае:

— Уваходзьце, калі ласка!

У глыбіні лабараторыі за столікам ля акна сядзіць дзяўчына. У час папярэдняй сустрэчы Святлана, нібыта апраўдваючыся, што яе амаль немагчыма застаць дома, гаварыла: «На факультэце я гадзін да шасці кожны дзень...»

Пачаць расказваць пра Святлану Голад можна было б з яе захаплення літаратурай, можна было б адкрыць сакрэт: яна піша вершы. Для душы, для сябе.

Літаратура займае шмат часу ў жыцці Святланы Голад, студэнткі IV курса біяфака, ленінскай стыпендыяткі. Але калі б я пачала так, гэта была б няпраўда: самая любімая справа Святланы — біялогія, навуковая работа.

Я задаю традыцыйнае пытанне: што лепш — ведаць усё пра нямногае ці патроху аб усім.

— Лічу, што кожны чалавек павінен ведаць крыху аб усім. Інакш гэта будзе дрэнны субяседнік, проста нецікавы чалавек. Аб чым з ім размаўляць, калі ён, акрамя сябе, кола сваіх абавязкаў, нічога і бачыць не жадае, нічым не цікавіцца? Але, з другога боку, кожны чалавек, каб быць найбольш патрэбным людзям, павінен ведаць і ўсё пра нямногае — ўсё, што датычыць яго прафесіі...

Колькі Святлана сябе памятае, яна заўсёды любіла прыроду. Яшчэ ў дзяцінстве гадзінамі магла любавацца восеньскім паркам, аголенымі галінкамі і прыгожым залатым дываном. Потым знаёмыя дрэўцы пакрываліся пушыстым белым снегам, а вясной зноў раскрывалі сваё ярка-зялёнае лісце...

Але да дзевятага класа будучае дзяўчыне ўяўлялася велічным будынкам радыётэхнічнага інстытута. А вось у дзевятым нешта перавярнулася. Перад ёю адкрылася біялогія — цудоўная навука, якая аб'яднала ўсё, што так цікавіла дзяўчыну. І адразу ж пакарыла генетыка.

Цяпер Святлана ўспамінае свае ваганні з усмешкай: «дзіцячае» захапленне прыродай даўно ўжо ўвайшло ў яе жыццё, і назаўсёды. Тэма яе курсавой работы — «Спадчыннасць якасных і колькасных прыкмет у жоўтага лубіну».

— Я цяпер займаюся сістэматызацыяй сабранага ў час летніх канікулаў матэрыялу...

Святлана мала гаворыць пра сваю вучобу. З першага класа і да дзесятага яна вучылася на выдатна. Гэта ўвайшло ў звычку, стала жыццёвым прынцыпам. А Святлана не такі чалавек, каб адступаць ад сваіх прынцыпаў.

З першага курса актыўна займаецца і грамадскай работай. Спачатку — староста групы, потым член камітэта камсамола факультэта, рэдкалегіі і, нарэшце, член камітэта камсамола універсітэта. Зараз яе галоўны абавязак — работа з першакурснікамі.

— Хочацца знайсці нейкі больш эфектыўны падыход да пачынаючых студэнтаў, — дзеліцца яна. — Больш аператыўна перадаць ім назапашаны вопыт.

Мы доўга размаўлялі аб грамадскай рабоце, сябрах і выкладчыках. Але яшчэ больш — аб паэзіі і літаратуры наогул.

— Да восьмага класа я не разумела паэзію. Але аднойчы мне трапілі ў рукі вершы Асадава. Абыякавай я не магла застацца. Потым былі Еўтушэнка, Пушкін, Лермантаў, Цютчаў...

Мы доўга размаўлялі пра ўзвышаную, лірычную, шчырую гераіню Льва Талстога. І пра Марціна Ідэна — героя Джэка Лондана, пра няспынны складаны пошук Дастаеўскага і паэтычную прынцыповасць Тацьянічавай. Пра каханне, дабро, шчасце, шчырасць...

Я пакідала біяфак з нейкім, можна так сказаць, прасвятленнем душы. Ці то ад цікавай размовы, ці то ад знаёмства са шчырым, добрым чалавекам. А можа, ад таго і другога.

**Т. ПАДАЛЯК,**
**студэнтка журфака.**
**Фота аўтара.**

# ЯК РОДНЫ ДОМ

Наш сённяшні расказ — пра трох жанчын. Усе яны працуюць у інтэрнатах універсітэта, усім ужо за семдзесят. І ёсць у лёсах гэтых жанчын нешта падобнае.

Ірына Іванаўна Іванова працуе вахцёрам у інтэрнаце № 2, Вера Якаўлеўна Казловіч — тэхнічкай у інтэрнаце № 4, а Аляксандра Сямёнаўна Парфімовіч — дворнікам у інтэрнаце № 1.

Добра памятае Аляксандра Сямёнаўна, як яшчэ ў маленстве засталася без бацькоў, пачала працаваць. У школу хадзіць не давялося, была хатняй гаспадыняй, швачкай. І вось ужо 30 гадоў працуе яна ў інтэрнаце № 1. За гэтыя гады — ніводнага прагула, ніводнай скаргі.

У Веры Якаўлеўны ўзнагарод няшмат, але пашана ёй у калектыве вялікая. Без малога дваццаць гадоў працуе ўжо ў інтэрнаце. Гледзячы на яе, рухавую, ветлівую, заўсёды гатовую дапамагчы, стараюцца і сяброўкі. У характары Веры Якаўлеўны яны вызначаюць дабрату, прынцыповасць.

Ірына Іванаўна працуе ў інтэрнаце № 2 з дня яго адкрыцця. Да гэтага доўгія гады жыла ў Мар'інай Горцы, дзе працавала бухгалтарам у аб'яднанні «Белсельгастэхніка». Узнагароджана медалём «Ветэрану працы», яе імя занесена на Дошку гонару лепшых работнікаў АГЧ. Карыстаецца заслужанай павагай калег па працы, студэнтаў.

Не раз прапаноўвалі гэтым жанчынам, улічваючы іх узрост, пайсці на заслужаны адпачынак. «Ды нельга нам, — прызнаваліся тыя, — бо інтэрнат нам як родны дом». І гэта сапраўды так.

**В. ВІШНЕЎСКІ, В. ЗАЙЧЫКАВА, І. ЗЫБАЙЛА, М. ЮРЫС, студэнты.**



**Вось і прыйшла пара дзяржаўных экзаменаў. На стале — урачысты чырвоны абрус. У вазе — прыгожыя кветкі. Уважлівыя, сур'ёзныя твары членаў дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, крыху ўсхваляваныя — у студэнтаў. Сёння вельмі важны экзамен — па навуковаму камунізму.**

**НА ЗДЫМКАХ: экзамен па навуковаму камунізму на факультэце прыкладной матэматыкі; члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі дацэнт кафедры гісторыі КПСС Галіна Аляксееўна Калініна, кандыдат філасофскіх навук Уладзімір Адамавіч Жагора, загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК кандыдат фізіка-матэматычных навук Мікалай Андрэевіч Лепяшынскі, сакратар камісіі Ала Леанідаўна Булатава; на пытанні адказвае Гасым Рамазанаў.**



● ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# У ГОД ЮБІЛЕЙНЫ

РАСКАЗ пра кафедру замежнай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна хочацца пачаць з невялікага, на першы погляд лірычнага адступлення.

Быў цёплы красавіцкі надвячорак. З тых, што так рэдка сустракаліся гэтай вясной. На універсітэцкім стадыёне, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Здавалася, жыхары ўсіх трох інтэрнатаў па вуліцы Кастрычніцкай прыйшлі сёння іменна сюды. Але так толькі здавалася. У ленінскім пакоі на восьмым паверсе інтэрната нумар сем сабраліся студэнты-філолагі і выкладчыкі — супрацоўнікі кафедры замежнай літаратуры. Сабраліся на літаратурны вечар.



Ён атрымаўся. Размова ішла пра сучасны лацінаамерыканскі раман, пра літаратуру краін сацыялізму, пра сусветную культурную спадчыну наогул. Былі цікавыя меркаванні, змястоўныя расказы. Я заўважыў, як су'рёзна ставіліся выкладчыкі да выказванняў студэнтаў, да іх вывадаў і абагульненняў. Назіралася нейкая духоўная сувязь людзей, улюбёных у літаратуру, у багаты, складаны свет вобразаў, думак, пачуццяў.

— Такія сустрэчы сталі ўжо традыцыйнымі,—расказвае загадчыца кафедры дацэнт Ірына Вікенцьеўна Шаблоўская.— Дзе, як не тут, можна паспрачацца, так-так — паспрачацца на тэмы, што выходзяць за межы праграмы, паразважаць над творамі таго ці іншага замежнага празаіка, паэта, падкрэсліць асаблівасці яго мастацкага светаадчування... Не проста даць студэнту пэўны аб'ём ведаў, а навучыць яго лагічна мысліць, на кожную з'яву мець уласны, і прытым правільны пункт гледжання — вось наша галоўная задача.

У справядлівасці слоў Ірыны Вікенцьеўны можна пераканацца, калі пазнаёмішся з курсавымі работамі студэнтаў філалагічнага факультэта, у якіх разглядаецца творчасць замежных пісьменнікаў. Грунтоўныя, напісаныя з веданнем справы, яны выклікаюць у чытача жывую цікавасць. А самі тэмы—«Прырода гумару Л. Кэрола», «Тэма мастацтва ў рамане У. С. Маэма «Тэатр», «Тэма адчужанасці ў «пластычным тэатры» Т. Уільямса (на прыкладзе ранніх аднаактовых п'ес)» — гавораць аб сур'ёзнасці распрацовак. Дарэчы, многія літаратурныя творы, аб якіх ідзе гаворка ў курсавых работах, на рускую мову не перакладзены, і студэнтам часта прыходзіцца звяртацца за дапамогай да выкладчыкаў.



— Навуковы кіраўнік маёй курсавой работы «Паэтычны свет у раманах У. Сараяна»,— гаворыць студэнтка II курса Валянціна Акуліч, — Таццяна Дзмітрыеўна Кірылава. Яна спецыялізуецца па англійскай літаратуры, дасканала валодае некалькімі замежнымі мовамі. Шмат працавала са мной, дапамагала перакладаць арыгіналы...

На кафедры мне паказалі карту Савецкага Саюза, якая стракаціць чырвонымі кропкамі — імі абазначаны ВНУ краіны, што прыслалі сваіх прадстаўнікоў на Усесаюзны семінар-нараду «Актуальныя праблемы методыкі выкладання дысцыплін класічнай філалогіі і і замежнай літаратуры». Нарада была арганізавана кафедрай замежнай літаратуры сумесна з кафедрамі французскай, іспанскай і лацінскай моў БДУ. Сярод удзельнікаў нарады — вучоныя з МДУ імя М. В. Ламаносава, Горкаўскага і Адэскага універсітэтаў, Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага і Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР. А наогул кафедра падтрымлівае шырокія сувязі з навуковымі цэнтрамі сацыялістычных краін: Кракаўскім, Сафійскім, Пражскім, Браціслаўскім універсітэтамі.

Акрамя лекцыйных курсаў па гісторыі замежнай літаратуры на філалагічным і завочным факультэтах, на гістарычным і факультэце журналістыкі, кафедра выконвае значную грамадскую работу. Яе супрацоўнікі выступаюць з дакладамі перад школьнікамі і моладдзю горада, чытаюць лекцыі ва універсітэце літаратуры, што існуе пры Палацы Белсаўпрофа...

За плынню будзённых спраў, за шматлікімі планавымі і няпланавымі мерапрыемствамі не забываюць тут пра звычайную чалавечую ўвагу. Мне давялося быць сведкай таго, з якой цеплынёй і ўсхваляванасцю віншавалі маладзейшыя выкладчыкі сваіх калег, ветэранаў Вялікай Айчыннай,— Валянціну Міхайлаўну Цімафееву, Барыса Паўлавіча Міцкевіча, Рэма Іванавіча Брагіна з Днём Перамогі. Хіба можа існаваць без усяго гэтага сапраўдны калектыў?



Год сёлетні — адметны для кафедры. 20 гадоў назад яна выдзелілася ў самастойную адзінку, стала першым і пакуль адзіным у рэспубліцы цэнтрам паглыбленага вывучэння замежнай літаратуры. За гэты час яе навукова-педагагічны калектыў падрыхтаваў да друку вялікую колькасць манаграфій і брашур, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, звыш 200 навуковых артыкулаў. У розных вышэйшых навучальных установах рэспублікі працуюць выкладчыкамі былыя аспіранты кафедры.

Сёння, напярэдадні юбілею, кожны супрацоўнік кафедры— і пачынаючы педагог, і вопытны ветэран—у пастаянным пошуку, у творчым гарэнні.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**



●

**НА ЗДЫМКАХ: ідзе пасяджэнне кафедры, якое праводзіць І. В. Шаблоўская; дацэнт Б. П. Міцкевіч; манаграфіі і іншая друкаваная прадукцыя, выдадзеная супрацоўнікамі кафедры; дацэнт В. М. Цімафеева сярод студэнтаў.**

**Фота В. ШАЧАКА.**



● ВАЧАМІ ЗАМЕЖНАГА СТУДЭНТА

## Героі побач з намі

У САВЕЦКІМ САЮЗЕ я часта чую такую фразу: «Героі жывуць побач з намі». І вось 9 мая гэтага года мне стаў зразумелы яе сэнс.

Усе студэнты, што жывуць у інтэрнаце № 2, ведаюць немаладую жанчыну — ліфцёра. Яе імя — Ганна Мікалаеўна Пачтарова. У Дзень Перамогі яна прыйшла на работу вельмі прыгожай, а на грудзях у яе зіхацелі медалі. І мне захацелася пагутарыць з ёю.

**— Ганна Мікалаеўна, скажыце, калі ласка, за што Вы атрымалі гэтыя ўзнагароды?**

— У час Вялікай Айчыннай вайны я спявала ў ансамблі. Мы выступалі перад нашымі воінскімі часцямі, паднімалі баявы дух байцоў. Удзельнікі ансамбля таксама былі салдатамі. Даводзілася і жыць у зямлянках, і удзельнічаць у баях, і перавязваць параненых. Я лічу, што мы выконвалі свой салдацкі абавязак сумленна. І ганаруся сваімі ўзнагародамі.

**— Вы выступалі перад салдатамі з канцэртамі. За гады вайны іх было вельмі многа. Які з франтавых канцэртаў Вам больш за ўсё запомніўся?**

— Кожны канцэрт па-свойму памятны. Але мне зараз хочацца расказаць аб выступленні перад лётчыкамі французскай эскадрылы «Нармандыя—Нёман». Мы вельмі хваляваліся на тым канцэрце. Выступалі многія артысты, выконваліся разнастайныя нумары, а рэакцыя слухачоў была надта спакойнай, апладзіравалі яны, здавалася, з ветлівасці. А мы ж ведалі, што французы вельмі эмацыянальны народ. Аказалася, што адзін з французскіх лётчыкаў — самы малады і смелы — не вярнуўся ў той дзень з баявога задання. Усе перажывалі за таварыша.

Але канец у гэтай гісторыі шчаслівы. Самалёт маладога лётчыка сапраўды падбілі, але ён з парашутам спусціўся да партызан. Яны дапамаглі яму вярнуцца на свой аэрадром.

А наш канцэрт закончыўся цудоўна. Я спявала народную французскую песню на рускай мове, яе падхапілі французы. І ўжо не было тут ні слухачоў, ні артыстаў...

**— Ганна Мікалаеўна, а як Вы сустрэлі Дзень Перамогі?**

— О, гэта было некалькі незвычайна. Мы знаходзіліся на тэрыторыі Германіі, недалёка ад Берліна. Напярэдадні нас папярэдзілі аб небяспецы: лінію фронту прарвала танкавая групіроўка нямецкіх войск. І вось уначы чуем шум, стрэлы. Першая думка — фашысты. І толькі калі мы выбеглі на вуліцу, убачылі, што гэта нашы салдаты пускаюць ракеты ў паветра, абдымаюцца і цалуюцца, — мы паверылі, што настаў канец вайны, і не змаглі ўтрымацца ад слёз...

Я падзякаваў Ганне Мікалаеўне за гутарку і падумаў аб тым, што калі Радзіма пакліча, усе савецкія людзі выступяць на яе абарону. Няхай гэта жанчына не здзейсніла геранчнага подзвігу, але героем мы называем кожнага, хто змагаўся за Радзіму.

**Роберт МАСА (Уганда),**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

**ПАЗЫЎНЫЯ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА**




# ПРАДОЎЖЫЦЬ ТРАДЫЦЫІ

НЕЗАБЫЎНАЙ старонкай у жыцці студэнтаў застаецца гарачая пара трэцяга працоўнага семестра. З кожным годам студэнцкі будаўнічы рух разгортваецца ўсё шырэй і шырэй. Толькі на філалагічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна сёлета створана сем будаўнічых атрадаў. Сярод іх СБА «Мара», які з 1974 года выязджае на палі сонечнай Малдавіі. І ў гэтым годзе «Мара-82» не змяніла сваім традыцыям. Дзевяты год атрад будзе працаваць у калгасе імя Жданава Слабадзейскага раёна.

Шмат было цяжкасцей у падрыхтоўчым перыядзе ў камандзіра атрада Т. Буркун, студэнткі III курса філалагічнага факультэта беларускага аддзялення, у камісара — другакурсніцы З. Васілеўскай з таго ж аддзялення. Састаў атрада абноўлены больш чым напалавіну. У гэтым годзе ў ім будуць працаваць 14 студэнтаў - першакурснікаў і толькі 9 вопытных байцоў. Сярод іх засталіся ў саставе «Мары» стажоры з ГДР і студэнтка-трэцякурсніца з ПНР.

**І. ПАГАСЯН,**
**студэнтка філфака.**

# «РАСІНКА» ЗНОЎ У ДАРОЗЕ

ЗДАЕЦЦА, кожны, хто чуе расказы студэнтаў аб трэцім працоўным семестры, загараецца жаданнем прыняць у ім удзел, таму што толькі у будатрадзе можна паказаць і даказаць, на што ты здольны, толькі тут можна, адпрацаваўшы цэлы дзень, забыць аб стомленасці.

«Расінка»... Так назвалі свой атрад дзяўчаты з механіка-матэматычнага факультэта. І вось ужо ў 10-ы раз атрад збіраецца ў дарогу.

Сваё баявое хрышчэнне «Расінка» атрымала на пладоваагароднінннай базе ў г. Мінску. Затым 7 гадоў працавала на палях калгаса імя У. І. Леніна ў сяле Копанка Малдаўскай ССР. А мінулым летам байцы атрада працавалі на якуцкай зямлі ў пасёлку Сярэбраны Бор.

Доўга будуць памятаць дзяўчаты і Мінск, і Копанку, і Сярэбраны Бор. І не толькі памятаць, але і расказваць навічкам аб традыцыях атрада.

А ў гэтым годзе «Расінка» збіраецца ў Малдавію. Будзем працаваць на заводзе. Зноў новае месца, зноў новы від работы.

**Л. ГАЙДУК,**
**баец СБА «Расінка».**

● **РАСКАЖУ ПРА ТАВАРЫША**

# *ІНІЦЫЯТАР ДОБРЫХ СПРАЎ*

У КОЖНАЙ СПРАВЕ патрэбен свой ініцыятар — чалавек, які вядзе за сабой іншых. Член прафкома універсітэта Віктар Кананові, здаецца, і ёсць такі чалавек.

Прафком жыве бурлівым і напоўненым жыццём. Адны выходзяць, другія заходзяць у пакой 302. Не паспяваеш адказваць на кожнае прывітанне. Прафоргі пытаюцца пра маркі і ўзносы, некаторыя студэнты хацелі б паехаць у прафілакторый, дзяўчаты з фізфака просяць білеты ў кафэ «Гаўдэамус»...

Вось і зараз, хоць рабочы дзень ужо закончыўся, у пакой раз-пораз заходзяць наведвальнікі.

— Скажыце, калі ласка, у прафкоме ёсць пуцёўкі на турбазу?

Хоць Кананові непасрэдна і не звязаны з размеркаваннем пуцёвак, але ён тлумачыць:

— Павінны быць. Вы падыйдзіце заўтра да намесніка старшыні прафкома Ніны Туромшы...

І так заўсёды. Віктар усіх выслухае (я не раз здзіўлялася, як у яго хапае на гэта цярпення), адкажа на ўсе пытанні, дасць параду, і чалавек уходзіць задаволены.

Віктар Кананові, студэнт чацвёртага курса мехмата, узначальвае арганізацыйна-масавую камісію прафкома. На яе пасяджэннях заўсёды ідзе ажыўленая размова аб надзённых справах. Студэнты дзеляцца вопытам работы, уносяць цікавыя прапановы. Тут жа падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі. Віця ўмее цікава весці такія пасяджэнні. Калі трэба, Кананові строга спытае, калі трэба — пахваліць, выслухае. Пра сур'ёзныя справы трэба гаварыць сур'ёзна. Толькі пры такіх умовах можна дабіцца поспеху.

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

# АДРАСЫ ЎДАРНЫХ СПРАЎ

ПАЧЫНАЕ свой імклівы разбег лета. Праз тры-чатыры тыдні студэнцкія будаўнічыя атрады адправяцца на месцы дыслакацыі, на месцы сваіх ударных спраў.

У год 60-годдзя ўтварэння СССР ва універсітэце сфарміравана 100 атрадаў, дружных, ініцыятыўных калектываў добраахвотнікаў. 100 калектываў студэнтаў, улюбёных у будатрадаўскі рух, жадаючых сваімі рукамі пакласці цагліну ў будынак камуністычнага грамадства. 100 калектываў юнакоў і дзяўчат, якія імкнуцца загартаваць сябе ў напружаным працоўным семестры.

Большасць СБА будуць працаваць на сяле. Вось чаму як баявую праграму дзеяннаў успрынялі ўсе ўдзельнікі працоўнага семестра матэрыялы майскага Пленума ЦК КПСС, даклад, з якім выступіў на Пленуме таварыш Л. І. Брэжнеў.

«Бліжэйшая задача — дабіцца ўжо ў гэтым годзе істотнага павышэння прадуктыўнасці земляробства і жывёлагадоўлі, забяспечыць выкананне і перавыкананне дзяржаўных планаў закупак збожжа, мяса, малака і іншай прадукцыі, яе своечасовую перапрацоўку і поўную захаванасць, стварыць надзейную аснову для больш хуткага ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці ў наступныя гады», — гаворыцца ў пастанове майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС. Усе байцы студэнцкіх атрадаў універсітэта не пашкадуюць сіл і энергіі, каб справай адказаць на заклік партыі, унесці свой дастойны ўклад у выкананне Харчовай праграмы.

Працоўнае лета студэнтаў універсітэта будзе праходзіць:

**1. Малдавія — 14 СБА**
**2. Стаўраполле — 1 СБА**
**3. Мінск — 12 СБА, з іх 2 — камуністычныя атрады**
**4. Віцебская вобласць — 16 СБА**
**5. Карэлія — 9 СБА**
**6. Хабараўскі Край — 4 СБА**
**7. Мінская вобласць — 30 СБА**
**8. Усць-Ілімск — 1 СБА**
**9. Пскоўская вобласць — 5 СБА**
**10. Уральская вобласць — 1 СБА**
**11. Башкірыя — 1 СБА**
**12. Якуція — 1 СБА**
**13. Цюмень — 2 СБА**
**14. Праваднікі на чыгунцы — 3 СБА**

● **НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ**

# ЗАКОН АБАВЯЗКОВЫ ДЛЯ ЎСІХ

ТЭЛЕФОННЫ ЗВАНОК, які прагучаў красавіцкім вечарам у дзяжурнай частцы Ленінскага райаддзела міліцыі, быў незвычайным. Звані лі з кафэ-бара «Свіслач». Хуліганіў падвыпіўшы замежны грамадзянін. Дзяжурным нарадам міліцыі, які прыбыў, быў устаноўлены і затрыманы замежны студэнт М., грамадзянін адной з краін Цэнтральнай Афрыкі, навучэнец архітэктурна-будаўнічага тэхнікума Мінска. Знаходзячыся ў нецвярозым стане, ён парушыў грамадскі парадак, лаяўся. На заўвагу прытрымлівацца цішыні і спакою М. адказаў грубасцю, аказаў непавінавенне законнаму патрабаванню работніка міліцыі. За хуліганскія дзеянні народным судом Ленінскага раёна ён быў прыцягнуты да адказнасці і арыштаваны на дзесяць сутак. Парушаць закон не дадзена права нікому.

Вось ужо пяць месяцаў прайшло з моманту ўступлення ў сілу новага закона «Аб прававым палажэнні замежных грамадзян у СССР», у аснову якога пакладзены прынцып роўнасці перад законам усіх людзей, незалежна ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі і іншых абставін. Прыняцце гэтага закона — яшчэ адзін крок у справе развіцця і ўдасканалення сацыялістычнай дэмакратыі, красамоўны доказ таго, што Савецкая дзяржава няўхільна выконвае міжнародныя пагадненні, што яна верная духу Хельсінкі. З другога боку — прыняцце закона ярка падкрэслівае відавочную неабгрунтаванасць правакацыйнай кампаніі, якую разгарнулі рэакцыйныя колы шэрагу імперыялістычных краін пад надуманым лозунгам абароны «правоў чалавека». Такі закон мог быць прыняты толькі ў грамадстве, дзе ўлада належыць народу, на сцягу якога напісаны лозунг велізарнага сацыяльнага значэння: «Усё ў імя чалавека, для карысці чалавека».

Важнейшае палажэнне новага закона — прадастаўленне замежным грамадзянам у СССР нацыянальнага рэжыму. Гэта азначае, што яны карыстаюцца ў СССР тымі ж правамі і свабодамі і нясуць тыя ж абавязкі, што і савецкія грамадзяне, калі іншае не выцякае з Канстытуцыі СССР і іншых актаў Савецкага Заканадаўства. Усе яго палажэнні знаходзяцца ў поўнай адпаведнасці з тымі абавязацельствамі, якія прыняў на сябе Савецкі Саюз, падпісваючы міжнародныя дагаворы, пагадненні і канвенцыі.

Асаблівасцю, якая вызначае новы закон, з'яўляецца заканадаўчае замацаванне сацыяльна-эканамічных правоў замежных грамадзян у СССР і гарантый здзяйснення такіх правоў. І сёння нікога не здзіўляе ў СССР, што замежныя грамадзяне маюць права на атрыманне дзяржаўнай кватэры, на пенсію, дапамогу, атрымліваюць аднолькавую зарплату, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і г. д. Гэтым савецкі закон прынцыпова адрозніваецца ад законаў капіталістычных краін, дзе толькі фармальна дэкларыруюцца правы замежных грамадзян без рэальнага забеспячэння гэтых правоў на практыцы.

Прынцып роўнасці замежных грамадзян у правах з савецкімі грамадзянамі абумоўлівае і прынцып іх роўнай адказнасці перад законам. Гэта адказнасць наступае для замежных грамадзян, якія зрабілі злачынства або правапарушэнне на тэрыторыі СССР, таксама на роўных падставах з савецкімі грамадзянамі.

У артыкуле 7 Закона, прынятым на падставе артыкула 37 Канстытуцыі СССР, гаворыцца: «Знаходзячыся ў СССР, замежныя грамадзяне абавязаны паважаць Канстытуцыю СССР і прытрымлівацца савецкіх законаў, з павагай ставіцца да правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця, традыцый і звычаяў савецкага народа...»

Усяму свету вядомы добразычлівасць і гасціннасць савецкіх людзей да тых, хто прыязджае да нас з добрымі намерамі і з павагай ставіцца да нашых законаў і правілаў. Аднак ёсць яшчэ асобныя замежныя грамадзяне, якія дапускаюць правапарушэнні, парушаюць заканадаўства аб прававым становішчы замежных грамадзян у СССР, а часам здзяйсняюць і злачынствы, за што нясуць і абавязаны несці поўную адказнасць.

**В. МАТУСЕВІЧ.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

3 чэрвеня 1982 г.

АТ 03299 Заказ 1102.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ